рызуюць іх: *дубовая галава* – “неразумны, някемлівы чалавек”, *з мухамі ў носе* – “капрызлівы, узбаламучаны”.

У маўленні фразеалагізмы выконваюць разнастайныя функцыі – намінатыўную, вобразнага выказнання, ацэначнаю, эмацыянальную, экспрэсіўную, моўнай характарыстыкі персанажа, стварэння гумару і г.д. Фразеалагізмы шырока выкарыстоўваюцца пісьменнікамі як сродак дасягнення выразнасці мастацкага тэксту для больш дакладнага адлюстравання пэўнай з’явы, прадмета, персанажа.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1. Лепешаў І.Я., Фразеалогія сучаснай беларускай мовы / Вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ. – Мінск: Вышэйшая школа, 1998. – 271 с.

УДК 811.161.3

# СУЧАСНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ПАЭЗІЯ: КАЦЯРЫНА ГЛУХОЎСКАЯ І ЮЛІЯ ЦІМАФЕЕВА

*Студэнты – Халадзінская А.А., 92 э, 1 курс, АЭФ;*
*Хартановіч А.М., 43 тс, 1 курс, ФТС*
*Навуковы кіраўнік – Фокіна І.С., ст. выкладчык*
*УА «Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт»,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя** Людзі ведаюць шмат пра беларускіх паэтаў мінулага, але працы творцаў нашага часу асабліва не асвятляюцца. Дадзеная праца знаёміць з творчасцю і асноўнымі тэмамі двух цікавых маладых сучасных беларускіх паэтэс.

**Ключавыя словы:** Сучасная паэзія, лірычнасць, творчасць.

Паэзія важная частка жыцця. Яна дапамагае людзям выказаць свае пачуцці і думкі, расказаць пра сваё жыццё і жыццё народа. У наш час людзі, на жаль, сталі менш цікавіцца літаратурай, але нельга недаацэньваць ролю слова. Дадзеная праца – спроба пазнаёміць з творчасцю двух цікавых маладых сучасных беларускіх паэтэс Кацярыны Глухоўскай і Юліі Цімафеевай.

Забываюцца дзеці, забіваюцца ў сэрца куточак.
Зачыняюцца дзьверы, забіраецца восень на цьвік
На парозе маім, як анёл, засынае каточак:
Не дае зачыніцца, ды ключык згубіўся ці знік.
Гэта значыць, што той, хто блукае цяпер па  дарозе,
Хто ня можа ўзгадаць твар бацькоў

Ці не бачыць сябе,
Можа, у сэрца маё паглядзіць
І прытулак папросіць,
І тады я сьпяю яму песьню аб сьветлай журбе.
Кацярына Глухоўская «Дзьверы»

У сваім вершы Кацярына Глухоўская падымае тэму адзіноты і тэму бацькоў і дзяцей у наш час. Як важна знайсці чалавека, які падставіць плячо, падтрымае і дасць параду. Тэму бацькоў і дзяцей, гэтую вечную праблему, вельмі важна асвятляць, каб дапамагчы пазбегнуць многіх праблем і памылак, за якія потым вельмі дорага расплачвацца. Яна выкарыстоўвае такія выяўленчыя сродкі, як параўнанне, увасабленне, метафару, якія дапамагаюць зразумець асобасны погляд паэта на свет і адчуць атмасферу верша.

Юлія Цімафеева падымае ў сваім вершы тэму спажывецкага стаўлення да прыроды:

Вуліца мусіць
служыць машынам і пешаходам.
Вуліца мусіць
ад скрыжавання да скрыжавання
быць роўнай і падатлівай.
Вуліца, названая ад нараджэння
ў гонар вусатага генерала,
мусіць па-дзявочы прыязна ўсміхацца
сваёй белазубай раздзяляльнай паласой,
пакуль вірлавокія светлафоры
і шыракаплечыя хрушчоўкі
будуць сачыць без перадыху
за чысцінёй яе пляскатага цела.

Але ніхто з іх не ведае,
што вуліца прарастае ўнутр,
што вуліца выхавала пад сабой горы,
якія цягнуцца пахілымі вяршынямі
да самага цэнтру зямлі;
што вуліца выпусціла з сябе рэкі,
яны, смеючыся, вольна сцякаюць,
пазбягаючы грэбляў і мастоў.
Вуліца легла тварам уніз,
і пакуль топчуцца па ёй пешаходы

і коламі прыціскаюць яе машыны,
вуліца ціха й пяшчотна спявае
недзе там у душы,
пад асфальтам.
Юлія Цімафеева «Вуліца»

У эпоху сучасных тэхналогій і ўсеагульнага спажывання, людзі сталі забываць, што некаторыя рэчы не вечныя, і ставіцца да іх як да дадзенасці. Сваім вершам Юлія Цімафеева нагадвае, што горы, рэкі і многае іншае стварыла прырода, і ставіцца да гэтага трэба беражліва. Каб данесці да нас асноўную думку, яна выкарыстоўвае такія выяўленчыя сродкі як увасабленне, метафару, параўнання і эпітэты.

Падводзячы вынік, можна сказаць, што, безумоўна, тэмы, якія ўздымалі паэты ў мінулым стагоддзі і цяпер, адрозніваюцца. Мяняюцца часы, і адны актуальныя праблемы прыходзяць на змену другім. Але галоўнае, што і цяпер знаходзяцца таленавітыя паэты, якія ўздымаюць важныя праблемы і не баяцца казаць пра галоўнае.

**Спіс выкарастаных крыніц**

1 Глухоўская Кацярына. Калі дрэвы растуць з галавы / Галіяфы, 2013. – 150 с.
2 Цімафеева Юлія. Цырк / Выдавецтва Зміцера Коласа, 2016. – 72 с.

УДК 008

## НАПОЛЕОН ОРДА. ХУДОЖНИК, КОТОРЫЙ ОСТАНОВИЛ ВРЕМЯ

*Студент – Вербицкий И.В., 42 тс, 1 курс, ФТС*
*Научный руководитель – Дятко И.М., ст. преподаватель*
*УО «Белорусский государственный аграрный технический университет», г. Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация.** Наполеон Орда – знаменитый художник, композитор, пианист, писатель. Он занял особое место среди выдающихся общественных и культурных деятелей не только Беларуси, но и всего мира.

**Ключевые слова:** художник, композитор, творчество, период, отображение, усадьба, памятное место, акварель.

Наполеон Орда – знаменитый художник, композитор, пианист, писатель. Он занял особое место среди выдающихся общественных и культурных деятелей не только Беларуси, но и всего мира.